ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ’90 УНІВЕРСІТЭТ

ЧАЦВЕР
20 ВЕРАСНЯ

№ 24(1653)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ПАДПІСКА-90

Падтрымайце!

З 1 верасня пачалася падпісная кампанія. Яна праходзіць у незвычайных умовах — беспрэцэдэнтна сцісłыя тэрміны (верасень — кастрычнік), падаражанне амаль усёй прэсы. Апошняе выклікана значным павышэннем цэн на паперу, друкарскія работы, паслугі Саюздруку.

Часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна» ў ліку тых нямногіх рэспубліканскіх выданняў, якія прапануюць найбольш выгадныя ўмовы падпіскі. *3 РУБЛІ — ТАКІ КОШТ НА ГАДАВУЮ ПАДПІСКУ ЧАСОПІСА. КОШТ АДНАГО НУМАРА — РУБЕЛЬ.* Падаражанне па серыях «Весніка» ў 1991 годзе складае: С. I — 15 капеек, С. II — 45, С. III і С. IV — 60 капеек.

Зазначым, што нават пры ўстаноўленай цане страты ад выдання часопіса павялічацца ў два разы і гэта, натуральна, гаворыць аб тым, што мы не мяркуем перакладваць усе выдаткі на плечы падпісчыкаў.

Мы таксама разумеем, што лепшая рэклама часопісу — яго змест. Але многае залежыць і ад таго, як прапагандзіруецца і папулярызуецца выданне. Вось чаму ў час правядзення ведамаснай падпіскі мы разлічваем на дапамогу і падтрымку ў справе папулярызацыі адзінага ў рэспубліцы навукова-тэарэтычнага часопіса: Веснік БДУ» з боку факультэтаў, лабараторый і кафедраў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў і аспірантаў — усіх, хто салідарны з нашым выданнем.

Напамінаем паштовы індэкс часопіса: С. I — 74851; С. II — 74852; С.III — 74853; С. IV — 74854.

ПАДПІСКА НА «ВЕСНІК БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА» ПРЫМАЕЦЦА Ў АДДЗЯЛЕННЯХ СУВЯЗІ БЕЛАРУСІ, ГАРАДСКІМІ І СЕЛЬСКІМІ ПАШТАЛЬЁНАМІ, ПРАДПРЫЕМСТВАМІ ПА РАСПАЎСЮДЖВАННЮ ДРУКУ, А ТАКСАМА Ў СПЕЦЫЯЛЬНА ВЫДЗЕЛЕНЫХ КІЁСКАХ І МАГАЗІНАХ «САЮЗДРУК».

РЭДАКЦЫЯ І РЭДКАЛЕГІЯ ЧАСОПІСА.

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

Чакаем прапаноў

Нягледзячы на тое, што ў яе адрас гучыць сёння нямала крытыкі, партыйная арганізацыя працягвае жыць і дзейнічаць, трымаючыся на энтузіязме тых, для каго партыйны білет не проста сведчанне прыналежнасці да яшчэ аднаго грамадскага фарміравання. Але каб нанова заваяваць аўтарытэт у народа, ёй патрэбна падтрымка народа. Толькі тады, калі планы і задачы будуць намячацца з удзелам простых камуністаў, яны будуць ажыццяўляльныя.

Аб гэтым ішла размова на нядаўнім пашыраным пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта, на якім прысутнічалі сакратары цэхавых пярвічных арганізацый. На ім было прынята рашэнне 12 кастрычніка правесці справаздачна-выбарную партыйную канферэнцыю БДУ.

Зараз у парткоме ўжо створаны і працуюць рабочыя групы па падрыхтоўцы і правядзенню справаздач і выбараў. Асноўная задача іх — улічыць думку кожнага члена КПСС, прыслухацца да меркаванняў радавых камуністаў. Не саромейцеся, заходзьце, нясіце вашы прапановы і пажаданні, заўвагі і парады.

Прадстаўнікі універсітэта будуць мець права голасу і на 30-й гарадской партыйнай канферэнцыі(мы павінны накіраваць туды 10 дэлегатаў), на XXXI з'ездзе Кампартыі Беларусі (2 дэлегаты).



Ёй папярэднічалі поўныя трывогі тэлефонныя званкі ў мясцовую СЭС і рэктарат Белдзяржуніверсітэта. Студэнты-другакурснікі юрыдычнага факультэта, што прыехалі сюды на ўборку ўраджаю бульбы, былі вельмі ўстрывожаны размовамі мясцовых жыхароў аб грашовай надбаўцы за пражыванне ў «чарнобыльскай зоне».

Падазрэнні ўзмацняла і тое, што праўленне калгаса не спяшалася ўнесці яснасць, зрабіць замеры ў іх прысутнасці. Калі ж узроўні радыяцыі на полі і ў вёсках, дзе жылі студэнты, былі, нарэшце, вызначаны, яны ўжо нікому не верылі. Свой характар будучыя «будаўнікі» прававой дзяржавы паказалі на імправізаванай сустрэчы з прыехаўшымі да іх прарэктарам С. А. Малевічам, намеснікам дэкана юрфака В. М. Хомічам і выконваючым абавязкі старшыні калгаса А. Б. Нелюбам.

Антон Браніслававіч з цяжкасцю вытрымаў націск маладых інтэлектуалаў, якімі кіравала жалезнае і бясспрэчнае «мне неабходна — дай!» Размова ішла пра незаключаны да гэтага часу дагавор аб лазні, кошце харчавання, аб расцэнках. Усё гэта дапытлівыя юнакі патрабавалі неадкладна, і абавязкова на талерачцы. Хоць энтузіязму ніхто з іх да гэтага часу не праявіў. «Я не якут, мне патрэбна памыцца»,— заявіў пад дружны смех адзін з актывістаў, а яго таварыш дадаў пасля сходу, што лазня ўсё ж такі была і працавала, ды вось толькі ў чарзе пастаяць трэба было.

ПАКУТЫ ПА «БУЛЬБЕ»

Сустрэча са спецыялістамі

ПА «КАЧАННЮ» ЎЛАСНЫХ ПРАВОЎ АДБЫЛАСЯ Ў КАЛГАСЕ

Патрабаванні ставіліся катэгарычна, і, я б сказаў, нават бязлітасна. Тлумачэнні і перакананні ніхто са студэнтаў не слухаў і не чуў. Калі навуковы супрацоўнік кафедры ядзернай фізікі Уладзімір Гурыновіч аб'явіў вынікі замераў узроўню радыяцыі на бульбяным полі (а ён аказаўся не вышэй дапушчальных нормаў), адказам яму было панічнае пярэчанне аднаго з юнакоў: «Ды ў нас жа зямля пад нагамі гарыць ад радыяцыі!» Вось і паспрабуй дакажы што-небудзь у такой абстаноўцы. Тым больш што на «бульбу» паехала толькі трэць курса, ды яшчэ з месца дыслакацыі ў горад вярнулася 25 чалавек. Тым, што засталіся, крыўдна, што іх лічаць «пахарамі» і «прастачкамі».

А повара Людмілу Уладзіміраўну Жалток можна толькі пашкадаваць — на яе намаганні, якія яна прыклала для таго, каб накарміць студэнтаў, тыя адказалі элементарнай няўдзячнасцю. У гутарцы задавалі тон бязлітаснасць і эгаізм. Вочы жанчыны былі поўныя слёз: «У мяне двое дзяцей, я іх суткамі не бачу, муж на сесіі, а яны...» — яна махнула ў бок памочнікаў калгаса, якія няспешна разыходзіліся.

«ЧЫРВОНЫ СЦЯГ» ВАЛОЖЫНСКАГА РАЁНА

НА ЗДЫМКАХ: замер на «полі сутыкнення» робіць навуковы супрацоўнік кафедры ядзернай фізікі БДУ У. Гурыновіч; дазіметры паказваюць — фон у норме.

Фота С. ГРЫЦА.

«ГЭТА ПРЫЛАДА РАБОТЫ»

НА ПАЛІЦАХ КНІГАРНІ

Так вызначыў слова вядомы рускі пісьменнік У. Г. Караленка. Для кожнага з нас яно стала такім прывычным, што мы не заўважаем часта, якім бясцэнным багаццем валодаем. Якім будзе знаёмства з мовай, залежыць ад настаўніка. Галоўная задача яго — абудзіць у дзяцей жывую цікавасць да вывучэння рускай мовы. У гэтым плане добрай падмогай педагогу стане падручнік «Занимательно о русском языке» (аўтары В. Іванова, З. Паціха, Д. Разэнталь).

«Рыхтуй сані летам...» — гэта парада для студэнтаў-філолагаў, якія хутка стануць маладымі спецыялістамі. Упэўнены, кніга дапаможа вам заваяваць увагу аўдыторыі, пазбегнуць многіх крытычных сітуацый, захапіць дзяцей. Яна пабудавана ў выглядзе невялікіх расказаў на пэўную тэму, да якіх дадзены займальныя загалоўкі (для гэтай мэты выкарыстаны прыказкі, прымаўкі, крылатыя выразы, цытаты з вядомых вершаў).

Набыць дапаможнік вы можаце ў кніжным кіёску галоўнага корпуса універсітэта. Магчыма, вашу ўвагу прыцягнуць і наступныя выданні: Іванов В. «Историческая грамматика русского языка», Мурина Л. «Методика русского языка в школах Белоруссии», Скороход Л. «Словарная работа на уроках русского языка» і іншыя.

ЁСЦЬ КАНТАКТ!

Навуку ў адзіночку не асіліш

Напэўна, зараз кожны з нас, сустракаючы гасцей, адчувае нейкую няёмкасць: за пустыя паліцы магазінаў, за бясконцыя чэргі да прылаўкаў — за ўсе нашы нязручнасці. Але гэтыя госці асаблівыя. Іх не палохаюць нашы часовыя цяжкасці — яны ўпэўнены, што эканоміка ў краіне ў хуткім часе абавязкова стабілізуецца. Таму і прынялі рашэнне пашыраць супрацоўніцтва.

З гэтай нагоды і завітала ў БДУ дэлегацыя Рурскага універсітэта г. Бохума (ФРГ) на чале з рэктарам, прафесарам В. Масбергам. На сустрэчы ў рэктараце абодва бакі сышліся на тым, што навуковае і культурнае супрацоўніцтва паміж двума універсітэтамі толькі на карысць ім. Варта і надалей працягваць абмен высокакваліфікаванымі спецыялістамі, у рамках якога прадугледжана выкананне сумесных навуковых даследаванняў, чытанне лекцый, правядзенне семінараў. Дарэчы, дыяпазон навуковых сувязей у 1991—1992 гадах значна пашырыцца. Ён уключае наступныя тэмы: геаметрычныя і стахастычныя метады лінейнага аналізу; спектраскапічныя даследаванні цвёрдых цел і вадкіх крышталяў; даследаванні і распрацоўка вымяральных сістэм для аналізу параметраў хуткапрацякаючых працэсаў; полінаміяльныя і рацыянальныя апраксімацыі і іх прылажэнні да рашэння задач матэматычнай фізікі; руска-нямецкія філасофскія сувязі на мяжы XIX—XX стагоддзяў; лінгвістыка тэкста.

Засталіся задаволены госці з ФРГ і культурнай праграмай, арганізаванай для іх беларускімі калегамі. Яны з цікавасцю наведалі сталічныя музеі, з'ездзілі на экскурсію ў Хатынь і на Курган Славы.

ПІНГ-ПОНГ

Радасць заўчасная

Ці праўда, што сёлета на педагагічных патоках ВНУ замест курса па грамадзянскай абароне будзе чытацца медыцынская падрыхтоўка?

С. МАЗАНІК,
студэнтка.

Мы вырашылі не паддавацца чуткам і папрасілі адказаць на пытанне загадчыка кафедры грамадзянскай абароны Л. А. ФРАЛОВА:

— Наконт гэтага ёсць ужо пастанова Савета Міністраў СССР. Яна абавязвае нас перагледзець вучэбныя праграмы і змяніць іх з улікам тых патрабаванняў, якія ставіць жыццё. Сапраўды, на педагагічных патоках усіх без выключэння факультэтаў будзе чытацца медыцынская падрыхтоўка.

Хачу крыху расчараваць нашых студэнтаў — у нас новаўвядзенне пачне дзейнічаць толькі з наступнага года. Сёлета вучэбны год ужо пачаўся, а факультэты не гатовы для такіх кардынальных перамен. Праўда, ёсць навіна для другакурснікаў — у раскладзе заняткаў грамадзянскай абароны яны не знойдуць.

Мінулае ў чырвонай папцы



...Яе бацьку забілі, калі ёй было 16 гадоў. Забілі! Яна пра тое не ведала, і яе маці таксама. Доўгі час яны нагул не ведалі пра яго нічога. І шукалі. Спачатку маці, потым, пасля яе смерці, дачка. Знайшлі яго сляды, даведаліся пра час і нават месца гібелі. Прозвішчы забойцаў засталіся невядомымі. Ды й гэта не той выпадак, калі катамі трэба лічыць толькі тых, хто непасрэдна здзейсніў катаванне. Віна за гэта забойства, як і яшчэ за сотні тысяч, нават мільёны, ляжыць не на адным чалавеку, на многіх...

Зразумела, размова ідзе пра рэпрэсіі, у даным выпадку — 30-х гадоў. Стаміліся мы ад яе, нарэшце, аскому яна паспела нагнаць. Пэўна, не так гаворым? Сотні тысяч — гэта не ўражвае ўжо. Тым больш, адна нечая смерць. Ці наадварот? Можа, падрабязнасці крушэння канкрэтнага лёсу, поўнага знікнення жывога чалавека больш жыхлівы? Кожнаму вырашаць гэта для сябе — як дазваляе светаўспрыманне і чуллівасць сэрца...

...Дачка шукае бацьку пасля смерці маці ўжо дзесяць гадоў. Яе завуць Вікторыя Міхайлаўна Гольман-Салаўёва. Слова «пошук» здаецца вельмі гучным для таго, што яна робіць, калі глядзіш на незлічоныя паперы, якія здабывала яна ў розных канцах краіны. Даведкі, адказы, адмоўныя і станоўчыя, чорныя — як пасведчанне аб смерці бацькі, і больш светлыя — як паведамленне аб месцы яго пахавання...

Не для ўсіх клопат аб багацці сваёй кроўнай памяці — норма. І ўсё ж гэта натуральна, калі чалавек хоча ведаць лёс свайго бацькі. А вось калі ён яшчэ імкнецца данесці свет бацькоўскага жыцця да многіх іншых людзей — гэта здзіўляе. Вікторыі Міхайлаўне ўжо амаль семдзесят. Але яе высакародныя дзеянні напоўнены нястрымнай энергіяй і рэдкім цярпеннем. Яна зрабіла копію кожнай афіцыйнай паперы, атрыманай у адказ на яе запытанні (адны копіі аддавала на ксеракс ці ў фоталабараторыю, другія друкавала на машынцы сама), шматразова размнажвала адзінкавыя экземпляры фотаздымкаў бацькі. Усё гэта патрабавала грошай і часу — чаго ніколі не было ў яе багата. З сабраных дакументаў яна аформіла 14 (!) аднолькавых таўшчэзных папак і разаслала іх у тыя месцы, дзе давялося працаваць яе бацьку. У тым ліку — у БДУ. Так, Міхаіл Барысавіч Гольман працаваў у нашым універсітэце, калі ён яшчэ называўся Мінскі Дзяржуніверсітэт. Прыехаў у Мінск у 1927 годзе, скончыўшы эканамічны факультэт Інстытута Чырвонай Прафесуры. Да 1929 года Міхаіл Барысавіч быў дацэнтам педагагічнага факультэта і факультэта права і гаспадаркі, а таксама ўзначальваў кафедру сусветнай гаспадаркі універсітэта, і адначасова выкладаў у Камуністычнай ВНУ і вячэрнім рабочым універсітэце.

Гэтым гадам папярэднічала бурлівая і разнастайная дзейнасць: у 1917 годзе Гольман з'яўляўся старшынёй Савета сялянскіх дэпутатаў у Магілёве, затым ваяваў у Чырвонай Арміі ў час грамадзянскай вайны; у 1919—1920 гг. жыў у Сімбірску, быў членам губкома РКП, загадчыкам губернскай партшколы і губернскага аддзела народнай асветы, старшынёй рэвалюцыйнага трыбунала, а затым рэктарам Сімбірскага дзяржаўнага універсітэта; у 1921—1922 гг. на рабоце ў Краснадары — член Кубана-Чарнаморскага аблвыканкома; потым за мяжой — як прадстаўнік выканкома Камінтэрна ў Турцыі і Персіі. Праца ў Мінску была апошнім звяном гэтага ланцуга, бо скончылася арыштам. Можна сказаць, што на гэтым скончылася і жыццё, хоць наперадзе заставалася яшчэ восем гадоў.

Ніхто не ведае, якімі былі дні, праведзеныя Міхаілам Гольманам у зняволенні: спачатку ў Цюменскай вобласці, потым ў Іркуцкай, пасля ў Енісейску Краснаярскага краю, Архангельску і, нарэшце, у Варкуце. Абвінавачванні, што прад'яўляліся, гучалі проста: «За контррэвалюцыйную прапаганду і агітацыю». Былі і іншыя фармуліроўкі, але ўсе з аднолькавай сутнасцю — чалавека каралі за тое, што ён НЕ ТАК думаў. У параўнанні з чым НЕ ТАК? Цяжка адказаць зараз.

Углядзіцеся ў вочы чалавека на гэтых фотаздымках. У іх розум, полымя душы, прага жыцця, вера ў лепшае і... тое, чаго ў вачах сённяшніх людзей ужо не знойдзеш.

Што яшчэ засталося пасля Міхаіла Барысавіча Гольмана, акрамя гэтых дзівосных вачэй на фотакартках? Вікторыя Міхайлаўна захоўвае як самае дарагое нават тыя дакументы, дзе прозвішча яе бацькі проста ўпамінаецца. Але ёсць у яе, акрамя гэтага, яшчэ спіс яго выдадзеных навуковых прац, якія і сёння можна знайсці ў Дзяржаўнай бібліятэцы СССР імя Леніна ці ў Ленінградскай публічнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына:

1. Гольман М. Б. Усеагульны крызіс капіталізму ў свеце поглядаў Маркса-Энгельса і Леніна.

2. Гольман М. Б. Усеагульны крызіс капіталізму. Уводзіны ў вывучэнне сучаснага крызісу сусветнай капіталістычнай гаспадаркі.

3. Гольман М. Б. Манапалістычны капіталізм у Расіі і будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

4. Гольман М. Б. Рускі імперыялізм (Кароткі нарыс развіцця манапалістычнага капіталізму ў Расіі да сусветнай вайны).

5. Гольман М. Б. Змест і формы закона нераўнамернага эканамічнага развіцця.

6. Гольман М. Б. Туган-бараноўшчына (Да крытыкі буржуазнай палітычнай эканоміі).



Вікторыя Міхайлаўна чытала гэтыя кнігі з вялікай цікавасцю. Некалькі з іх захоўваліся ў яе хатняй бібліятэцы з вырваным тытульным лістом, на якім стаяў бацькаў надпіс,— захоўваць дарагія літары было небяспечна. Гэтыя кнігі Вікторыя Міхайлаўна ўзяла з сабой на фронт. Там і згубіла — іх выкарыстаў нехта на распальванне печкі...

Усе лісты, якія дасылаў Міхаіл Барысавіч жонцы і дачцэ, яны вымушаны былі знішчыць, ён сам заклікаў іх да гэтага ў мэтах бяспекі. Засталося толькі некалькі радкоў, напісаных яго рукой на фотаздымках і на бланку грашовага перавода, дасланага з Архангельска.

На двух фотаздымках 1928 года Міхаіл Барысавіч пісаў: «Рупліва і хутка вучыся і рыхтуйся стаць работніцай у радах фабрычна - завадскога пралетарыяту...

З самых ранніх гадоў і да магілы будзь заўсёды на перадавым пасту ў штодзённай рабоце рэвалюцыйнага пралетарыяту супраць яго класавых ворагаў у палітыцы і навуцы, супраць дробнабуржуазных і мяшчанскіх забабонаў у быце. Станавіся ў рады прамысловых рабочых і прытрымлівайся парад і ўказанняў твайго сябра-бацькі ва ўсім. З гэтай мэтай навучыся грамаце і перапісвайся са мной.

Любячы цябе бацька М. Б. Гольман. Мінск, 1928».

З месц ссылкі, нягледзячы на цяжкія ўмовы, ён рэгулярна высылаў дачцэ грошы, пакуль меў права перапіскі. І гэта пры тым, што з 1924 года ён быў у разводзе з маці Вікторыі Міхайлаўны і меў новую сям'ю, дзе таксама гадавалася дачка.

Кароценькая запісачка на адвароце грашовага перавода: «Дарагая дачушка Вікачка! Пасылаю табе праз маму сто рублёў на ўзмацнёнае харчаванне, музыку і інш. за жнівень, так як у гэтым годзе мы наўрад ці ўбачымся... Нядаўна я напісаў табе і маме падрабязны адказ на тваё пісьмо і маміна з прапановай да мамы: адпусціць цябе да мяне (пакуль я знаходжуся на адным месцы да 1937 года) на два гады з тым, каб я падрыхтаваў цябе да самастойнага жыцця (у ВНУ, замежным мовам і музычнай прафесіі) да моманту надыхода твайго паўналецця (17). Чакаю матываванага і абдуманага адказу тваёй маці. Пішы часцей. Цалую моцна. Твой бацька. Прывітанне маці».

Тая паездка на два гады так і не адбылася. І ВНУ Вікторыя Міхайлаўна не скончыла, і музыцы не навучылася па-сапраўднаму. Можа, у тым ліку і таму, што не сустрэлася тады з бацькам. Складаючы біяграфію М. Б. Гольмана, яна напісала: «Са слоў маці я памятаю, што мой бацька быў нястомна працавіты, у яго было шмат добрых сяброў. Куды б яго партыя ні пасылала працаваць, ён заўсёды выконваў усе даручэнні добрасумленна. Любіў сям'ю, асабліва мяне і майго брата, які пазней памёр. У разводзе вінавата мая маці, бацька не жадаў губляць сям'ю, а з другога боку, калі б маці не была ў разводзе з бацькам, то з намі здарылася б тое ж, што з іншымі...»

Гэты ўрывак разам з усімі дакументамі Вікторыя Міхайлаўна даслала ў наш універсітэт у чырвонай папцы. Можа, іншай не аказалася там, дзе яна рабіла пераплёт. Можа, заказала яна менавіта чырвоны колер. Але нават калі гэта выпадковасць, то з тых, якія адлюстроўваюць нейкую незразумелую сувязь паміж усім, што толькі ёсць на свеце...

...Ён так хацеў, каб дачка атрымала ўсебаковую адукацыю. Ён сам быў па-сапраўднаму адукаванай асобай, толькі з замежных моў ведаў лацінскую, грэчаскую, англійскую, французскую, нямецкую і італьянскую. Але пры ўсім тым ён шчыра верыў тагачасным лозунгам, якія раптам перасталі ўспрымацца мы. Ён аддаваўся гэтым заклікам з усім жарам сэрца.

Вось як пачынаецца вялікі артыкул М. Гольмана, надрукаваны ў газеце «Известия» у Сімбірску 1 студзеня 1919 года пад назвай «Вынікі чырвонага года»: «У радасці і нягодзе, у тытанічнай барацьбе з новымі класавымі ворагамі, у стыхійнай барацьбе, народжанай у віру старога хаосу, пры аслепляльным бляску сваіх небывалых перамог святкуе сусветны пралетарыят сустрэчы Новага чырвонага года, і першы раз у гісторыі свайго існавання не дасылае праклёнаў адыходзячаму году, году не толькі жорсткай сутычкі двух светаў, году падзенняў, паражэнняў, памылак, але і творчасці і ўзмацнёнай жалезнай сілы, што выклікала да жыцця казачна светлае дзіця — сацыялістычную рэвалюцыю, цяпер ужо ўзмужалую, растучую, як лясныя грыбы пасля шчодрага дажджу.

У смутку і збянтэжанасці, у жаху перад насоўваючымся сусветным пралетарыятам, з істэрычнымі праклёнамі адварочваецца ад мінулага года сусветная буржуазія. Буржуазія замест традыцыйных віншаванняў з «новым шчасцем», з трапяткім жахам перад набліжэннем новага года, сімвала яе смяротнага ворага, што нясе ёй смерць пад агнявым мячом адплаты — буржуазія плаксіва і абыякава цэдзіць праз зубы: «З новым годам, з новым няшчасцем».

Сёння мы, пралетарыі ўсяго свету, як пераможцы, з заслужаным гонарам можам перагартаць старонкі мінулага года і, яшчэ раз захаваўшы ў сваім розуме незабыўныя этапы грандыёзнай барацьбы, назаўсёды ўвекавечаныя крывавымі фарбамі рэвалюцыйнай палітры на гістарычных скрыжалях чалавечай гісторыі,— з любасцю падвесці гадавыя вынікі здаровых расткоў светла-камуністычнага будучага...»

Ёсць у гэтых радках нейкая невытлумачаная моц, якая незаўважна ўзнаўляе ў душы пачуцці тых гадоў, калі чырвоны колер яшчэ сапраўды хваляваў усіх нас...

Магчыма, у людзях, народжаных рэвалюцыяй, і павінна была жыць такая непамерная і неразумная, на наш сённяшні погляд, вера, каб хоць рэшткі яе прасачыліся скрозь дзесяцігоддзі і пакінулі нам свежасць подыху тых людзей?

...Жыццё не забыла пра свае справядлівыя ўзнагароды для Вікторыі Міхайлаўны. У сям'і Гольман-Салаўёвых з'явіўся спачатку адзін мужчына — яе сын, а потым і другі — унук. Маці і бабуля ганарыцца імі. Калі паказвае іх фотаздымкі, просіць заўважыць падабенства абодвух са сваім бацькам.

— Вікторыя Міхайлаўна, Вам зразумелы ідэалы, за якія змагаўся Ваш бацька?

— Так! Я ведаю: ён жадаў, каб людзям лепш жылося...

В. БЯГУН.

НА ЗДЫМКАХ: М. Гольман, студэнт філалагічнага факультэта Харкаўскага універсітэта 1919 г.; М. Б. Гольман, дацэнт Мінскага Дзяржуніверсітэта, 1929 г.

Государственной безопасностьюн
Комп АССР-са
КОМИТЕТ
КОМИТЕТ
государственной безопасности
Комп АССР

167610 г. Сыктывкар, ул. Кирова, дом № 38

27 II.1989 г. № 10/5-КП-6644

На № _____ от _____

194021, г.Ленинград, ул.Карбышева дом 6, корпус 1, кв. 107

Гольман-Соловьевой Виктории Михайловне

Ваше заявление об установлении места работы отца – Гольман Михаила Борисовича до его ареста рассмотрено. Установлено, что последнее место работы Гольман Михаила Борисовича – Минский университет, руководитель кафедры экономических наук, с 1927 по 1929 год. В 1929 году был осужден. В период отбывания наказания в Архангельской области в 1937 году был вновь осужден. Архивы проверены. Других данных о его работе нет.

Начальник подразделения КГБ
Комп АССР

В.М.Полещиков

КАМПЕТЭНТНЫ СУБЯСЕДНІК

АДКУЛЬ ЯНА, НЕБЯСПЕКА?

— Яўген Міхайлавіч, давайце ўсё ж такі высветлім: нітраты, азот — што гэта: эліксіры ўрадлівасці ці каварныя ворагі?

— Як ні дзіўна, і тое, і іншае. І ніякага парадоксу ў гэтым няма. Калі ўносіць нітраты ў глебу ў малых або невялікіх колькасцях — яны прыкметна павышаюць ураджаі, прычым, не пагаршаючы якасці раслінной прадукцыі. А калі пачынаем злоўжываць — атрымліваем да стала атруту.

Асабліва востра гэтая праблема стаіць сёння, калі мы штодзённа маем інфармацыю аб радыяцыйным фоне ў рэспубліцы. Памыляюцца тыя, хто імкнецца пераканаць нас, быццам праблемы Чарнобыля і нітратаў нельга аб'ядноўваць. Ёсць нямала фактаў, якія пацвярджаюць, што нітраты, трапіўшы ў наш арганізм, узмацняюць эфект радыяцыі.

— Які механізм уздзеяння нітратаў на арганізм?

— Ён даволі няпросты. Самі нітраты (гэта солі азотнай кіслаты або сялітры) не шкодныя для здароўя чалавека. Але, трапіўшы ў арганізм, частка іх ператвараецца ў нітраты, а потым у нітразаміны, што з'яўляюцца найбольш моцнымі з вядомых канцэрагенных рэчываў. Калі нітраты садзейнічаюць развіццю такога захворвання, як медгемаглабінія, асабліва небяспечнага для дзяцей (гемаглабін крыві звязваецца нітратамі і не здольны пераносіць кісларод), то нітразаміны «выкрытыя» як узбуджальнікі анкалагічных захворванняў.

— Калі пытанне стаіць так сур'ёзна, з якога боку чакаць найбольшай небяспекі?

Нітраты, радыяцыя... Апошнім часам з'явілася шмат публікацый на гэту тэму. Адны нас трывожаць, іншыя супакойваюць, быццам бы не такі чорт страшны, як яго малююць. Ад гэткага рознагалосся можна і разгубіцца. А якая думка ў нашых вучоных?

Мы прапануем гутарку з дацэнтам кафедры аналітычнай хіміі БДУ імя У. І. Леніна, кандыдатам хімічных навук *Яўгенам Міхайлавічам РАХМАНЬКО.*

— Найбольш верагодныя крыніцы пранікнення нітратаў у арганізм — агародніна і караняплоды. Справа ў тым, што глебы Беларусі бедныя на азот, фосфар, калій. Таму, каб атрымаць добры ўраджай, робяць упор на хімізацыю сельскай гаспадаркі, у прыватнасці, выкарыстоўваюць азотныя ўгнаенні. Вынік — высокае ўтрыманне нітратаў у прадукцыі. Нягледзячы на тое, што гранічна дапушчальныя канцэнтрацыі (ГДК) на агародніну і садавіну даволі высокія, наяўнасць нітратаў у іх амаль заўсёды перавышае норму. Прывяду некаторыя ГДК на нітраты (адзінка вымярэння — мг/кг): кавуны, яблыкі, грушы, вінаград — 60; рэпчатая цыбуля — 80; дыні — 90; бульба, таматы, агуркі — 150; морква — 250; кабачкі — 400; капуста — 500; цыбуля-пяро — 600; буракі — 1500; салата, шчаўе, кроп, пятрушка — 2000.

З прыведзеных вышэй даных нават спецыялісту цяжка зразумець логіку з'яўлення тых або іншых значэнняў. Напрыклад, ГДК на вінаград 60 мг/кг, а на бульбу — у два з паловай разы вышэй. Можа, бульбяныя нітраты менш таксічныя? Не. Заснавальнікі гэтых паказчыкаў павінны былі суаднесці ГДК з доляй тых або іншых прадуктаў у рацыёне. Але і тут нічога не атрымліваецца. Ствараецца ўражанне, што спрацаваў вядомы прынцып планавання ад дасягнутага. Назапашвае тая ці іншая агародніна пэўную колькасць нітратаў — прымем яе за базавую ГДК. На жаль, і гэтыя паказчыкі рэдка захоўваюцца.

— Тым не менш, у прэсе з'яўляюцца публікацыі, у якіх аўтары хоць і не адмаўляюць таксічнасці нітратаў, але ўсё ж такі заклікаюць не панікаваць.

— Звычайна гэта людзі, якія абараняюць гонар мундзіра. Яны апялююць тым, што, у параўнанні з іншымі краінамі, у СССР нормы на нітраты заніжаныя. Для большай пераканаўчасці прыводзяць ГДК для буракоў у Галандыі, бульбы ў Японіі, салаты ў Швейцарыі, якія нібыта вышэйшыя за нашы. Але аўтары пры гэтым забываюць зазначыць іх долю ў рацыёне, бо таксічнасць нітратаў не вызначаецца толькі іх наяўнасцю ў якімсьці прадукце харчавання, а бярэцца сумарная колькасць, што трапіла з розных крыніц. Існуе і сутачная гранічна дапушчальная доза ўжывання нітратаў — 5 мг/кг вагі.

Параўноўваючы ГДК на нітраты ў СССР і іншых краінах, трэба памятаць, што ў развітых дзяржавах у сутачным рацыёне чалавека больш мяса, якое ўтрымлівае нязначную колькасць нітратаў, а раслінных прадуктаў менш. Да таго ж, пакупнік можа выбіраць, што яму купіць: на ўпакоўцы маецца інфармацыя аб утрыманні шкодных дамешак. На жаль, у нас пакуль што гэткай галоснасці няма.

— Ці не здаецца Вам, што падобныя доказы выклікаюць у гараджан рэакцыю адназначную: выключыць з меню агародніну і садавіну?

— Гэта рабіць, вядома, не трэба. Але і злоўжываць таксама няма сэнсу, асабліва калі вы не ўпэўнены, што прадукцыя чыстая. Трэба вельмі асцярожна ўключаць у меню тую агародніну, на якую ГДК высокія. Асабліва гэта датычыць людзей, схільных да розных захворванняў. Ім лепш не ўжываць бурак, радыску, капусту, зяленіва, асабліва ранняе.

А вось, яблыкі, грушы, персікі, абрыкосы, слівы і іншыя ягады назапашваюць шкодных рэчываў у межах дапушчальных ГДК — звычайна не вышэй за 100 мг/кг. Іх можна без боязі ўжываць як дарослым, так і дзецям.

— Многія гараджане вырошчваюць сельскагаспадарчую прадукцыю на дачах. Ці можаце Вы даць ім нейкія рэкамендацыі?

— Залішняя колькасць нітратаў залежыць ад віду раслічнай прадукцыі. Пералічаныя вышэй садавіна і ягады нават пры добрай падкормцы не назапашваюць залішняй колькасці нітратаў. Вырошчваючы іх, можна карыстацца не толькі арганічнымі, але і мінеральнымі ўгнаеннямі (у тым ліку і азотнымі). Няварта захапляцца багатай падкормкай градак з морквай, агуркамі, бульбай. Вырошчваць радыску, буракі, капусту лепш за ўсё на бедных глебах і пазбягаць ужывання нават арганічных угнаенняў. Безумоўна, гэта прывядзе да зніжэння ўраджаю, але ж гаворка ідзе пра ўласнае здароўе.

— Яўген Міхайлавіч, наколькі мне вядома, Вы амаль ці не першы ў рэспубліцы пачалі вывучаць праблему нітратаў у пітной вадзе...

— Сапраўды, гэтым пытаннем пакуль што мала хто займаецца. Гадоў пятнаццаць таму яго проста не існавала: горад піў воду толькі з артэзіянскіх свідравін. Але ў 1978 годзе здалі «пад ключ» Вілейска-Мінскую водную сістэму, і якасць вады значна знізілася. Нягледзячы на тое, што канцэнтрацыя нітратаў у вадзе, якую п'юць жыхары Мінска, у межах дапушчальнага (ГДК 44 мг/л), супакойвацца няма падстаў. Пітная вада для забеспячэння жыхароў Фрунзенскага, Кастрычніцкага і Маскоўскага раёнаў бярэцца з Вілейскага вадасховішча і для абеззаражвання хларыруецца. З-за гэтага ў ёй з'яўляюцца высокія канцэнтрацыі хлорарганічных злучэнняў, якія вельмі таксічныя для чалавека. Але да гэтага часу ў Мінску (як, зрэшты, і ў іншых гарадах) утрыманне хлорарганічных злучэнняў не кантралюецца, на іх не ўстанаўліваюцца ГДК.

— Не могуць жа людзі выкрасліць і ваду са свайго рацыёна, значна знізіўшы пры гэтым нітратную «нагрузку» на арганізм?

— Безумоўна, не. Але калі для піцця будзе выкарыстоўвацца (як гэта робіцца цяпер) вада санітарна-бытавога прызначэння, мы гэту праблему наўрад ці вырашым у бліжэйшай будучыні. Думаю, трэба пераняць вопыт забеспячэння пітной вадой у некаторых краінах, скажам, на Кубе (дарэчы, яе спатрэбіцца ўсяго толькі тры літры на чалавека за суткі). Ідучы на работу, жыхары правінцыяльнага горада Камагуэй у пэўны дзень тыдня раніцой пакідаюць у пад'ездзе дома пустыя дваццацілітровыя бутылі, у кожную з якіх апушчана плата за ваду (на нашы грошы гэта прыкладна 40 капеек). Увечары забіраюць іх напоўненымі. Вада гатуецца на спецыяльным заводзе. Першыя захады зроблены і ў нас: падобны завод будуецца ў Ташкенце.

Словам, нам трэба сёння шукаць выйсце са складанай сітуацыі, каб не пакідаць людзей сам-насам з небяспекай, якую нясуць нітраты і радыяцыя.

Гутарку вяла
З. АЛЯШКЕВІЧ.

ЗАГАД № 685

Палітграмата на новы лад

Анарха-сіндыкалісты і ліберальныя дэмакраты, марксісты і манархісты, сацыял-дэмакраты... Што хаваецца за гэтым спектрам палітычных утварэнняў? Часам неарганізацыі імкнуцца да вызначэння сваіх вытокаў — ідэйных папярэднікаў у мінулым, механічна пераносячы ў дзень сённяшні іх праграмныя патрабаванні.

Можна катэгарычна сцвярджаць, што ва ўмовах палітызацыі краіны, калі ідуць працэсы і палярызацыі, і кансалідацыі, без глыбокіх ведаў палітычнай гісторыі нельга назваць якаснай падрыхтоўку спецыялістаў ва ўсіх галінах: ад фізікаў да лірыкаў. Пад палітычнай гісторыяй асабіста я разумею комплекс, які ўвабраў бы ў сябе курс, што чытаецца зараз замест гісторыі КПСС, плюс вывучэнне непасрэдна паліталогіі пры глыбокім авалоданні агульнафіласофскай базай.

Практычная спроба ажыццяўлення такога метада ўжо прадпрымалася ў першыя гады Савецкай улады. Праўда, у межах адной вучэбнай дысцыпліны. У школах і ВНУ ўводзілася палітграмата — прымітыўнае, схематычнае выкладанне гістарычнага працэсу і асноўных марксісцкіх догм. Мэта сённяшняга палітычнага навучання — пазбаўленне ад закасцянелых ісцін і вяртанне да метадаў жывой дыялектыкі ў аналізе мінулага і сучаснага.

Патрабаванні да выкладчыкаў у гэтым выпадку значна ўскладняюцца. Ментар-«удзёўбвацель» падрыхтаваных і непагрэшных ісцін павінен ператварыцца ў старэйшага настаўніка, які б накіроўваў самастойны пошук студэнта, абуджаў яго думку, садзейнічаў палітычнаму станаўленню спецыяліста.

Памылковым назваў бы я адмаўленне ад курса «Гісторыя КПСС» на спецыяльнасці «Гісторыя». Спецыфічная роля партыі ў гісторыі нашай краіны дапаможа зразумець глыбінныя прычыны многіх з'яў у жыцці Савецкай дзяржавы.

Мікалай МАРЧАНКА,
выпускнік гістфака
1990 года.

БЫТ ЦІ НЕ БЫТ?

ДЗЕ Б ПАД'ЕСЦІ...

Надакучыла намацваць прарэхі на куртатым кафтане народнай адукацыі і высвятляць, хто, адкуль і колькі лапікаў адваяваў для сябе. Маланкавае падзенне ў бездань эканамічнага крызісу, калі прыняцце Усесаюзнай шматгаліновай мэтавай праграмы «Здароўе студэнтаў» і радкі дакладаў Дзяржкамітэта СССР па народнай адукацыі і Мінздрава СССР не гарантуюць паляпшэння сацыяльных умоў жыцця студэнтаў.

Праблемы студэнцкага харчавання абвастраюцца. Каго караць, каго мілаваць?

Зразумець імкненне работнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта заўчасна (не зважаючы на смету) заняцца рамонтам некаторых з шаснаццаці кропак харчавання пры неабходнасці касметычных пераўтварэнняў на астатніх? Паспачуваць галоўным выканаўцам рамонтных работ — кааператыву «Універсал»? Падлічыць грашовыя страты трэстаў сталовых з нагоды забарон санітарна-эпідэміялагічных станцый? І абвінаваціць ва ўсім... студэнта, які без дай прычыны, пасля прастудных захворванняў, хутчэй за ўсё падхоплівае страўнікава-кішэчныя. А ў яго няма часу на разблытванне гаспадарчых і фінансавых праблем прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Ён прыйшоў у ВНУ зусім не для таго, каб назапашваць хваробы і апынуўся перад фактам: на шосты дзень афіцыйнага пачатку навучальнага года ва універсітэце большасць кропак грамадскага харчавання не працавала.

Чаму навучальны год пачынаецца з пошукаў: дзе б што-небудзь перахапіць пад'есці?

СТАЛОВАЯ Ў ХІМІЧНЫМ КОРПУСЕ. Зрэшты, тут свята — устанавілі пасудамыечную машыну, за што не адзін год змагаліся. Радасць «падмочвае» хіба толькі тое, што не турбаваліся рамонтнікі за якасць і за вялікай машынай не разгледзелі занадта вузенькай адтуліны для сцёку вады.

Цяпер пасудамыйкі (як і іх сяброўкі па няшчасцю з катламыечнага цэху, дзе не пашкодзіла б крыху прыпадняць адстойнік, каб не вылівалася на падлогу вада з тлушчам) будуць стаяць па шчыкалатку ў гарачай вадзе. Самавынайдзеныя прыстасаванні — драўляныя стэлажы і справе не надта дапамогуць, і верагоднасць вытворчых траўмаў павысіць.

На час нашага наведвання (і другога ў гэтым навучальным годзе візіту прадстаўніка санэпідстанцыі) НЕ:

— працавала духоўка;

— быў устаноўлены матор для ахаладжвання вітрыны для закусак на лініі раздачы;

— была праведзена паліроўка падлогі, якая, між іншым, у смеце прадугледжана;

— працаваў тытан;

— быў абсталяваны зліўны трап каля электрычнай патэльні (знаходлівыя сантэхнікі абматалаі яго ізаляванай стужкай і пафарбавалі).

СТАЛОВАЯ Ў ІНТЭРНАЦЕ № 7 працавала толькі другі дзень, калі зноў выйшаў са строю адрамантаваны за лета зліўны трап і калі раптам зрабіліся чорнымі ад тлушчавага налёту на сталах жоўтыя паперкі ў руках правяраючых.

ЦЭХ ПА ВЫТВОРЧАСЦІ КАНДЫТАРСКІХ ВЫРАБАЎ па-ранейшаму займае невялікі закуток на тэрыторыі гэтай сталовай. Выконваючы кожнадзённы план (600 рублёў) па забеспячэнню нашых буфетаў, а таксама ларка ад сталовай № 33, дзяўчаты, якія працуюць у ім, мараць аб... сетцы ад мух. Які рамонт? Пафарбавалі сцены — крыху чысцей, калі не ўглядацца ў дробязі: не абсталявана мойка, няма прасейвацеля; новая печ не працуе, таму вымушаны «арандаваць» абсталяванне ў суседзяў; прадукцыю ў латках прыходзіцца прыстасоўваць на падлозе — не хапае стэлажоў; ніяк не знаходзіцца падсобнага памяшкання для захавання тары.

СТАЛОВУЮ ГАЛОЎНАГА КОРПУСА абновіць не капітальны рамонт, як раней планавалася, а вонкавы, касметычны.

А СТАЛОВАЯ № 61, што па вуліцы Маскоўскай, зачынена з 1 сакавіка.

— Спачатку два месяцы працавалі сантэхнікі, потым да сярэдзіны жніўня маляры,— праследжваем услед за загадчыцай вытворчасці Валянцінай Уладзіміраўнай ТКАЧЭНКА, якая вымушана пакуль працаваць у сталовай сярэдняй школы № 1, этапы «вялікага» рамонту.—Па графіку абяцалі адкрыць з 1 ліпеня.

Мяркуючы па той цішыні, што сустрэла нас на полі «бяздзеяння», і вялікіх пакунках ля «чорнага ўваходу», якія скрываюць ад людскіх вачэй не ўстаноўленыя яшчэ жаровачны шкаф і цестамясілку, чакаць нам усім давядзецца яшчэ доўга.

Няма гарачай вады, абліцовачнай пліткі, шкла, не хапае людзей для правядзення рамонту ў СТАЛОВАЙ БІЯЛАГІЧНАГА КОРПУСУ. Па іроніі лёсу, яе дзверы зачыніліся перад наведвальнікамі 27 жніўня. Вось дык падарунак для біёлагаў і радыёфізікаў, адрэзаных ад «цывілізаванага» свету вялікімі адлегласцямі!

Пачакаем караць ці мілаваць, спасылацца на пункты і параграфы, перакладваць цяжар адказнасці з аднаго кіраўніка на другога. ЗАЎВАЖЫМ У СТУДЭНЦЕ І ВЫКЛАДЧЫКУ ЧАЛАВЕКА, ЯКІ МАЕ ПРАВА НА САЦЫЯЛЬНУЮ АБАРОНУ ад такіх вось звычайных у нашай сістэме злачынстваў.

І пачнём з таго, што планавы рэйд па праверцы рэктаратам, прафкомамі, народнымі кантралёрамі гатоўнасці кропак грамадскага харчавання універсітэта да навучальнага года перанясём у будучым з кастрычніка на канец жніўня. Каб не шукаць вінаватых, а паспець выправіць памылкі. Зірніце на каляндар: хіба субота пачынаецца ў панядзелак?

З. МАРАВА.

ДЛЯ ЦЯБЕ

СВЕДЧАЦЬ САЦЫЁЛАГІ

Не хачу жаніцца!

35,9 працэнта студэнтаў лічаць, што, безумоўна, трэба ствараць сям'ю ў час вучобы. Аднак толькі 15 працэнтаў стацыянарнікаў ажыццяўляюць свае «шлюбныя» задумкі

— такія вынікі даследавання «Студэнцкая сям'я: становішча, праблемы, перспектывы», праведзенага ў 32 вышэйшых навучальных установах рэспублікі аддзелам даследавання маладзёжных праблем ЦК ЛКСМБ сумесна з лабараторыяй праблем маладзёжных рухаў сацыялагічнага навукова-даследчага цэнтра нашага універсітэта.

І калі, з аднаго боку, студэнцкая сям'я — гэта добра (40 працэнтаў «жанацікаў» заўважылі, што пачалі вучыцца лепш), то з другога — бытавая неўладкаванасць і эканамічная неплацежаздольнасць, бо толькі 50 працэнтаў ВНУ даюць студэнцкім сем'ям месцы ў інтэрнаце.

Каля 60 працэнтаў сямейных студэнтаў маюць дзяцей, прычым толькі пятая частка ад іх колькасці ўладкавала сваіх нашчадкаў у дзіцячыя дашкольныя ўстановы. Астатнім перашкаджае або тое, што дзіця яшчэ малое, або што не падышла чарга на яслі ці садок. У кожнай пятай-шостай студэнцкай сям'і бацькі не задаволены ўмовамі жыцця і выхавання сваіх дзяцей, дзве трэці не ў захапленні ад жылля. А 40 працэнтаў сямейных наогул не задаволены жыллёвымі ўмовамі, бо жывуць на прыватнай кватэры ці ў бацькоў, здараецца ж, і паасобку, у розных інтэрнатах.

І, безумоўна, грашовае пытанне. Хоць і атрымліваюць 90 працэнтаў сямейных студэнтаў стыпендыю, але ў шасцідзесяці дзевяці выпадках са ста даводзіцца раскашэльвацца бацькам, у трыццаці — маладыя падрабляюць самі, у сямнаццаці — атрымліваюць дзяржаўную дапамогу. Тым не менш, ***72,2 працэнта студэнцкіх сем'яў жывуць на мяжы ці за мяжой беднасці. Прычым у паловы грашовы даход на аднаго члена сям'і меншы за 50 рублёў.***

Так што, як бы ні пераконвалі сацыёлагі, што студэнцкія сем'і ўстойлівыя і перспектыўныя, а ўрачы, што студэнцкія гады — самы аптымальны ўзрост мужа і жонкі для нараджэння дзіцяці, у наш прагматычны век пытанне «Жаніцца ці не?» вырашаецца адмоўна.



Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

ВЯСКОВАЯ ПРЫГАЖУНЯ

Калі вы на «бульбе»...

Вы на «бульбе»? Спачуваем. Нічога добрага ад яе не дачакаешся. Пыл, дождж і вецер не прамінуць здзейсніць сваю «чорную справу». Калі ім не перашкодзіце вы самі.

Вось некалькі рэцэптаў, якія дапамогуць і ў вясковых умовах заставацца прываблівай:

КАЛІ СКУРА СУХАЯ,

рэкамендуем мыцца халодным настоем гарбаты, рамонкаў, бярозавага лісця, мяты (якім-небудзь з іх). На вільготную пасля мыцця скуру нанесці ваш звычайны пажыўны крэм. Праз пяць-сем хвілін прамакнуць яго сурвэткай.

ПАМОЧНІЦА-МАРКОЎКА

асвяжае твар і жывіць яго. Дзве морквы трэба пацерці, дабавіць сыры яечны жаўток, некалькі кропляў алею. Трымайце маску 20—25 хвілін, затым апаласніце твар халоднай вадой.

МАСКА З БУЛЬБЫ,

калі пацерці яе і дабавіць чайную лыжку талакна, а атрыманую кашыцу нанесці на 20 хвілін, змыць цёплай, а затым халоднай вадой, папярэдзіць высыханне скуры твару.

ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ

Чарадзейныя дробязі

Як думаеце, чым можна аб'яднаць чужыя па колеру і стылю рэчы? Магчыма, камізэлькай нейтральнага колеру? Гэта сапраўды выйсце! Лягчэй за ўсё аб'ядноўваць рэчы ў камплект праз чорны і белы колеры.

* * *

Ніткі, што назапашвала яшчэ бабуля, раптам скончыліся. У магазінах прывычная пустэча. А хочацца чагонебудзь новенькага! Адшукайце... стары швэдар. Нашыйце на яго кавалачкі футры і скуры, бліскучыя пацеркі, і атрымаеце унікальную рэч.

* * *

Калі атрымаецца набыць набор у магазіне «Зрабі сам», зможаце абнавіць джынсавую куртку, упрыгожыўшы яе какеткай з махрой з карычневай ці бэжавай скуры.

* * *

Другое жыццё прынясуць старым рэчам металічныя гузікі.

Homo sapiens

ЗДАРОВЫ ТОЙ, ХТО ВЕРЫЦЬ

Хацелася выконваць загады: закрыць вочы — павекі ж такія цяжкія, упасці ў забыццё і не варушыцца. Ціхаціха... Але я разамкнула павекі і сачыла за тымі, хто пакутуе. Пакасілася на суседку (у яе бранхіяльная астма) — корпус цела напаўнахілены, спакойна, рытмічна падымаюцца і апускаюцца плечы. Кінула позірк уперад — тая ж карціна: кожны імкнецца падпарадкоўвацца загадам-просьбам псіхатэрапеўта. А суседка потым сказала, што ёй зусім не хацелася выходзіць з таго стану: «Так бы далей і сядзела...»

...Гэта быў трэці па колькасці сеанс. Сістэма — шэсць. Таму, што чалавек мае схільнасць усё аналізаваць, пачынаючы са значэння слоў і заканчваючы асвятленнем, яму карціць знайсці ва ўсім крамолу, хоць і ўражвае навізна таго, што адбываецца. З гэтых «цаглінак» і складаецца бар'ер паміж урачом і пацыентам, які адразу не знікне. Неабходны час на прызвычайванне. Для каго хапае аднаго-двух сеансаў, а для каго і пяці-шасці мала. Ці не праўда, нагадвае гульню ў ножыкі: кінеш лязо ў зямельку — уваткнецца, у камень — адскочыць, добра, калі не зломіцца. Гэта — працэс узаемадзеяння.

Чалавек гадамі знясільваў сябе работай, жыццёвымі стрэсамі, атручваў няякаснымі прадуктамі харчавання, піццём, нажываючы сабе хваробы. А назапасіўшы іх, пераходзіць з адной крайнасці ў другую: то глытае пачкамі таблеткі, то адмаўляецца ад праверaных медыкаментаў і слухае толькі парады бабак-шаптух.

Вось і псіхатэрапія для некаторых яшчэ адна крайнасць. Часцей адбываецца так: хворы, не маючы веры, усё ж спадзяецца, што добры дзядзька за адзін сеанс зніме боль, адвядзе рухам рукі хваробы, што назапашваліся гадамі. Такі «шукальнік» здароўя прыходзіць на сеанс з пустымі вачыма, цяжкім сэрцам і недаўменна глядзіць на суседку, у якой на твары слёзы. «Вутка падсадная» — часам ляцяць словы. А. А. Галавач даражыць сваёй рэпутацыяй і «вутак» не падсаджвае. А вось іменна гэтыя жанчыны і атрымаюць хутчэй за ўсё выздараўленне, таму што паддаюцца сіле яго ўздзеяння: бар'ер пераадолены.

— Урачу - псіхатэрапеўту неабходна прарвацца праз самакантроль пацыента, а ўжо потым можна рэгуляваць яго стан праграмай унушэння тыпу: «галава ясная», «рука не баліць»... Унутры арганізма кожнага чалавека існуе сістэма аховы здароўя, якую неабходна актывізаваць, «завесці»,— расказвае А. А. Галавач.— Псіхатэрапія шкоды не прыносіць, а толькі карысць, але на ўсё патрэбны цярпенне і вера. Таму што гіпноз — гэта не сон, гэта асаблівы функцыянальны стан структур галаўнога мозга, якія працуюць у рэжыме камандаў псіхатэрапеўта. Актыўнасць надзвычай высокая. Мы — дзеці прыроды. І таму такія ж загадкавыя. Ланцуговую рэакцыю «слова-унушэнне-цела» вытлумачыць яшчэ нельга. Мабыць, гэта звязана з тэорыяй квантавага поля. Між тым, у кожнага індывідыума свой «экстрасенс», немаведама чаму на адных дзейнічае Кашпіроўскі, на другіх — я. Але ўсе дзеянні,— падкрэслівае псіхатэрапеўт, — гэта дар не божы і не сатанінскі. Гэта проста чалавечая прырода. І не больш.

Метадам унушэння ў гіпнозе можна вылечыць розныя функцыянальныя расстройствы нервовай сістэмы, неўрастэнію, захворванні эндакрыннай сістэмы, кішэчнага тракту, жоўцевага пузыра, скурныя, алергічныя захворванні, зняць болі апорна-рухальнага апарату, палепшыць зрок, слых, ліквідаваць дэфекты мовы, адвучыцца ад цыгарэт, алкаголю і іншых шкодных звычак.

Псіхатэрапеўт у адзіночку не працуе. Ён супрацоўнічае са спецыялістамі іншых профіляў медыцыны. Пацыентам А. А. Галавач раіць наведвацца да свайго ўрача, абследавацца, кантраляваць стан арганізма, сачыць за развіццём (можа і ў зваротным кірунку) хваробы.

Паколькі хваробы звычайна «спадарожнічаюць» адна адной, у кожнай паліклініцы, — сцвярджае ўрач,— павінен быць псіхатэрапеўт. Праўда, спецыялістаў не хапае (пазней за ўсіх ашчупнулася Беларусь). У самога Галавача прамых вучняў няма, да яго проста прыходзяць параіцца. І ён раіць, падказвае, дапамагае.

...Пасля сеансу А. А. Галавач запрасіў застацца тых, хто адчуў нейкія паляпшэнні.

...Скончыліся прыступы астмы, прайшлі пятнаццацігадовыя галаўныя болі, пачалося зажыўленне язваў, наладзіўся сон, жанчына з паралічам пасля інсульта пачала хадзіць, прадэманстравала прысяданне.

У наступны сеанс яны выйдуць да мікрафона. Бо зноў спрацоўвае вечная псіхалогія чалавечая: калі бачыш, што іншым дапамагае, а ты ўсё на месцы, з думкай «Няўжо я горшы?» пачынаеш і ў сабе шукаць сілы, без аглядкі аддаешся загадам псіхатэрапеўта.

Памятае лекар шмат пацыентаў з даволі дзіўнымі хваробамі, якіх ён змог вярнуць да нармальнага жыцця. М. у цяперашні час інжынер. Колькі гадоў назад меў такі «лаючы» кашаль, што ўся паліклініка збягалася. Н. не мог глытаць. Адзінаццаць гадоў кармілі праз зонд... Вылечылі...

Псіхатэрапія — гэта цікава. Але не трэба думаць, што яна — панацэя ад усіх бед. Усё залежыць ад чалавека. У гэтым сэнсе можна звярнуць увагу на кітайскую медыцыну. Лічыцца, што на першых месцах стаяць дыета, рэжым, рух, травы... А ўрач-хірург — у канцы спісу, калі ўжо іншага выйсця няма.

— Ёсць у маёй практыцы такі выпадак,— успамінае Анатоль Аляксеевіч,— калі да мяне з пытаннем «Што я магу зрабіць для сябе сам?» звярнуўся чалавек, які пакутуе ад стэнакардыі, у якога артэрыяльны ціск 160/100, які не мог зрабіць і дзесяці крокаў без болю ў вобласці сэрца. Я падказаў: па-першае, рэжым, харчаванне, па-другое, памяншэнне псіхаэмацыянальных нагрузак, патрэцяе, узрастанне фізічных.

Цяпер гэты чалавек бегае кожны дзень па дзесяць кіламетраў, на кардыяграме бачна, што на сэрцы рубцоў няма, працаваць можа не пакладаючы рук. У творчым плане — напісаў некалькі кніг. Усяго гэтага ён дасягнуў толькі дзякуючы сваёй сіле волі, імкненню да здароваго, паўнацэннага жыцця.

А наогул, у магчымасцях чалавека займацца псіхапрафілактыкай: мабілізоўваць свае здольнасці на дасягненне якой-небудзь мэты, умець адхіляць «занадта» — баюся, хачу...

Мабыць, кожны можа займацца самарэгуляцыяй, але тут павінен быць настаўнік-спецыяліст, які ведае праблему, які дапаможа знайсці на першым часе аптымальны варыянт індывідуальнага кантакту расшырэння свядомасці ў плане кіраўніцтва сваім арганізмам.

І вось такі чалавек, які можа і павінен дапамагаць людзям, быў невядомы. Толькі пасля буму Кашпіроўскага выйшаў на вялікія залы. Але існаваў і дагэтуль, у Анатоля Аляксеевіча быў свой шлях.

Зацікавіўся гіпнозам яшчэ да медінстытута. У ВНУ рабіў нясмелыя крокі ў гэтым кірунку. Але толькі працуючы пасля заканчэння пачаў усур'ёз займацца псіхатэрапіяй. Першыя аўдыторыі, групавыя сеансы. Лекцыі на прадпрыемствах.

Год дзесяць таму назад падняў пытанне аб стане псіхатэрапіі ў Беларусі, далі зразумець «зверху»: сядзі і не высоўвайся.

Адліга. Псіхатэрапію прызналі нібы роўнай сярод іншых профіляў медыцыны. А таварыства «Веды» да гэтага і пасля гэтага настойліва запрашала на сустрэчу з людзьмі.

— Першы цыкл масавых лекцый-сеансаў правёў на Віцебшчыне гэтай зімой. І зразумеў, у якім я даўгу перад хворымі, калі ўбачыў вынікі працы.

Зараз А. А. Галавач праводзіць сеансы раз у два тыдні ў ДК чыгуначнікаў, Доме настаўніка, МТЗ, палацы «Юнацтва».

У метадзе і стылі працы Галавача шмат агульнага з Кашпіроўскім: голас мяккі, але і строгі, словы, якія і ўгаворваюць, і патрабуюць бясспрэчнага выканання, светлавое, музычнае афармленне... Але кожны з псіхатэрапеўтаў да гэтага ішоў сваім шляхам. Так ужо атрымалася, калі абодва вырашылі, што іменна так — лепей.

Як і Кашпіроўскі, Галавач адкрывае ў сабе шмат раней не заўважаных магчымасцей, якія былі для яго сапраўднай неспадзяванасцю: нармалізацыя функцый суставаў пры поліартрытах, дэфармацыі суставаў, паляпшэнне зроку (асабліва блізарукасць), нармалізацыя ўзроўню цукру ў крыві, зажыўленне язваў, знікненне рубцоў...

ДАВЕДКА ДЛЯ ЦІКАЎНЫХ: сеансы Анатоля Аляксеевіча Галавача можна запісваць на касеты, відэакасеты, як лічыць ён сам, але спачатку неабходна папрысутнічаць: эфект будзе хутчэйшы і больш дзейсны. Таксама трэба мець індывідуальныя рэкамендацыі пры іх выкарыстанні. Яго сеансы магчыма спалучаць з сеансамі фіізіятэрапіі і іголкатэрапіі.

Наконт экстрасенсаў Галавач, як чалавек, лічыць, што калі ў каго-небудзь ёсць нейкія магчымасці дапамагчы людзям — хай дапамагаюць, а як вучоны — гэтыя магчымасці неабходна вывучаць.

— Гіпноз — яшчэ не зведаны, не вывучаны да канца. Гэта — тая мяжа медыцыны ў сферы несвядомага, калі выкарыстоўваюцца магчымасці самога чалавека (механізма-загадкі), — словы ўрача-псіхатэрапеўта А. А. Галавача.

Значыць, і я, і вы, і мы — загадкі. Для каго?

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

20 верасня
Зак. 2022.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.